# «ЗАДУМАЦЦА. І ЗНОЎ УЗЯЦЬ ПЯРО...»

*З паэтэсай Яўгеніяй ЯНІШЧЫЦ гутарыць крытык Тамара ЧАБАН*

**— Яўгенія Іосіфаўна! Напярэдадні сакавіцкага свята, з якім я віншую вас і нашых чытачак, відаць, ёсць патрэба пагаварыць пра феномен «жаночай лірыкі». Як сведчыць гісторыя літаратуры, жанчына мінулых вякоў таксама брала ў рукі пяро, але гэта былі адзінкавыя спробы. Такой масавай, а галоўнае, плённай працы жанчын на паэтычнай ніве, як гэта назіраецца ў наш час, літаратура яшчэ не ведала. Сцвярджаюць, і не без падстаў, што творчасць паэтэс стала «ядром» паэтычнага пакалення 70-х гадоў. Чым, на вашу думку, гэта выклікана?**

— Амаль дзесяць стагоддзяў назад у горадзе Кіёта — тады ён называўся Хэйтан і быў сталіцай Японіі — жанчына, вядомая пад іменем Сэй-Сёнагон, атрымала ў падарунак кіпу добрай паперы і пачала рабіць на ёй свае запісы, якія ў выніку з'явіліся унікальнай кнігай «Запіскі ля ўзгалоўя».

Кніга Сэй-Сёнагон шматгранная: ад бытавых сцэн, анекдотаў і навел да карцін прыроды, апісання прыдворных урачыстасцей і вострых замалёвак тагачасных звычаяў «хэйтанскай эпохі». У «Запісках» часта аспрэчваецца нераўнапраўнасць глыбока і тонка адчуваючай жанчыны. Уражвае ў кнізе чэпкі і дакладны малюнак чалавечага партрэта: некалькі трапных штрыхоў — і падабенства схоплена! Лірычная проза Сэй-Сёнагон узнялася да вышынь бліскучай паэзіі.

Калі я чытала гэтую унікальную кнігу, мне падумалася і аб іншых таленавітых жанчынах, якія жылі і тварылі даўно, скажам у XII—XVII стагоддзях! На гэтую думку, прынамсі, наводзяць славутыя вобразы Яраслаўны ці Прадыславы.

Таму, відаць, няма асаблівага дзіва, што ў наш час, у наш век шмат гавораць пра «жаночую лірыку», якая з'явілася вынікам інтэнсіўнага развіцця і росквіту нашага сацыялістычнага грамадства. Вядомы рускі літаратуразнавец і крытык Юрый Сураўцаў разглядае «жаночую лірыку» не толькі ў кантэксце ўсёй нашай шматнацыянальнай савецкай паэзіі, але і еўрапейскай, цытуе паэтэс часта з арыгінала, і гэта дае безумоўныя падставы да шырокай і зацікаўленай гаворкі пра «жаночую лірыку», якая стала асабліваю, прыкметнаю з'яваю ў літаратуры XX стагоддзя.

Успомнім хоць бы сусветна вядомыя ў паэзіі імёны Ганны Ахматавай і Марыны Цвятаевай. Яны пісалі вершы з зайздроснай класічнай мужчынскай хваткай, а споведзь сэрца ўсё-такі заставалася менавіта «інтымна»-жаночкай. У гэтым, якраз, магічная прыцягальнасць іх творчасці. Тут варта ўсё-такі нагадаць і яшчэ адну акалічнасць: Ахматава і Цвятаева не ўзышлі на абсалютна «жаночкім полі». Раскрыццю і развіццю іх таленту папярэднічала ўсё-такі... выдатная школа ў цэлага сузор'я класікаў-мужчын!

...Ядром паэтычнага пакалення? Відаць, не зусім. Паболшала жанчын у паэзіі — гэта так. Тут ёсць свае заканамернасці і прычыны. І адна з іх — усеагульная фемінізацыя (як і ў іншых прафесіях і спецыяльнасцях!). У нашай савецкай літаратуры, і ў асаблівасці ў паэзіі, прыток жанчын-паэтэс адбыўся, як мне здаецца, усё-такі за кошт... мужчын, якія не вярнуліся з мінулай вайны, мужчын, якія павінны былі нарадзіцца ў гады вайны і ў пасляваенны час. Але тое, што выйшла і выходзіць з-пад пяра нашых паэтэс, дае поўнае права на развагу аб сур'ёзных творчых набытках.

**— Паэт І. Анненскі, вітаючы прыход у паэзію жанчын, у прыватнасці Г. Ахматавай і М. Цвятаевай, пісаў: «Лірыка стала настолькі індывідуальнай і пазбаўленай агульных месц, што ёй патрэбны цяпер і тыпы жаночых музычнасцей. Можа быць, яна адкрые нам новыя лірычныя гарызонты, гэта жанчына, ужо больш не кумір, асуджаны на маўчанне, а наш таварыш у агульнай рабоце над рускай лірыкай». Якія лірычныя гарызонты, тыпы характараў, нюансы пачуццяў, лад думак адкрываюць сучасныя паэтэсы?**

— Сапраўдная паэзія ніколі не жыла без яўных прыкмет сучаснасці. Хочаш таго ці не хочаш, а сам час накладвае на характар чалавека, на яго побыт і паводзіны тыя клопаты і турботы сацыяльных абставін, у якіх ён жыве. Ад іх не вельмі проста адмахнуцца ці з галавою нырнуць у камернасць. Ды ці і магчыма гэта ў наш складаны, тэрмаядзерны век, калі так востра паўстала перад светам праблема вайны і міру?

Змяніўся, шалёна мяняецца час. Даўно змянілася жанчына пушкінскага строю. Хіба што славуты тыпаж някрасаўскай сялянкі, намаляваны паэтам яшчэ ў 1863 г. (паэма «Мороз, Красный нос»), не страціў дасюль некаторых прарочых і проста-такі здзіўляючых рэалій!

Дык вось, і паэтэсы майго ўзросту больш сталі мысліць, бязбоязна ўрывацца ў нялёгкі на жаночы пад'ём тэмы — трывога і боль за свет, за чалавека і яго высокае прызначэнне на зямлі. Прагрэс няспынна прымушае нас рухацца наперад, шукаць, і асабліва — творцу... З другога боку, тут непазбежна ёсць яшчэ і правіла бяспекі руху: спешка заўсёды перашкаджала ўдумлівай рабоце, як, скажам, тая ж пагоня за модай! Але тыя творы, тыя вершы, якія ствараліся і ствараюцца на гранічным напале натхнёнай і неабыякавай душы з тонкім, псіхалагічным пранікненнем у свет чалавека, не састарэюць ніколі.

**— Ці ёсць падставы гаварыць пра жаноцкую своеасаблівасць, адметнасць паэзіі вашых сучасніц? Ці адчуваеце вы гэтую своеасаблівасць у сваёй творчасці?**

— Жаночая своеасаблівасць у паэзіі, як і ва ўсіх галінах мастацтва, відавочная. Гэта неаспрэчна абумоўлена ўжо самой фізіялогіяй. На вяселлях ці сардэчных гасцінах—большасць песенных галасоў жаночыя. На пахаваннях (асабліва ў вёсках!) — таксама сустракаем раскутыя жаночыя галасы (раскутага мужчыну-плакальшчыка я бачыла толькі адзін раз!). Адсюль, відаць, і непадробны песенны пачатак жаночага голасу, мяккасць, сардэчнасць і шчымліва-пранізлівае гучанне лірычнай струны, калі яна толькі не апускаецца да «пялёначных плакатаў» ці мыцця кухоннага посуду! Калі тая ж жаночая фізіялогія, часам, упарта імкнецца ўвабрацца ў «рыцарскія даспехі» — гэта набывае іншы раз парадаксальную карціну. Я, прынамсі, за адметнасць і моц такога голасу, які выходзіць на свет усё-такі з грудзей, а не з лабараторыі сучаснай літаратурнай алхіміі. Якраз такая «алхімія», як мне здаецца, не пагражае нашай беларускай «жаночай лірыцы».

Што ж датычыцца маёй творчасці, то збоку лепш відаць.

**— Леся Украінка, якую І. Франко назваў «ці не адзіным мужчынам ва ўсёй саборнай Украіне», выказвала, між іншым, такую думку: «Мужчынская праўда ў поглядзе на некаторыя рэчы аднабаковая. Мы павінны дапоўніць яе сваёй жаночай праўдай». Мне здаецца, гэта не сцвярджэнне жаночых амбіцый, а глыбокае разуменне задач жанчыны-паэта, не толькі тагачасных, але і будучых.**

**Не хачу проціпастаўляць «мужчынскую» і «жаночую» праўду ў паэзіі, але, як мне здаецца, сучасны свет, наш супярэчлівы, трывожны час як ніколі мае патрэбу ў «жаночай» праўдзе — праўдзе захавання і прадаўжэння жыцця, роду чалавечага, збяражэння дому, яго цяпла, новага, не утылітарнага, а духоўнага, душэўнага прыручэння прыроды, у праўдзе жаночай вернасці, цэльнасці характару, самаахвярнасці, дабрыні і міласэрнасці. Мабыць, «фемінізацыя» паэзіі, акрамя іншых прычын, выклікана яшчэ і гэтай патрэбай.**

**У чым, на вашу думку, заключаецца місія сучаснай жанчыны-паэта?**

— Быць паэтам першай у свеце сацыялістычнай краіны, якая на асабістым гістарычным вопыце правярае надзейнасць выпакутаваных чалавечых ідэалаў, — гэта асаблівая адказнасць. Лепшае ў нашай савецкай паэзіі набывае высокае значэнне этычна-маральнага вобліку чалавека і чалавецтва. І калі слова паэта будзе праўдзівае і хвалюючае, то яно, безумоўна, павінна стаць данінаю павагі і любові народу, які ўзгадаваў нас і надзяліў правам дастойнага голасу.

**— Як мне здаецца, ваша паэзія традыцыйная ў добрым сэнсе гэтага слова. Традыцыйная не толькі і не столькі паэтыкай, колькі светааднуваннем, блізкасцю да фальклору, да народных маральна-этычных асноў. Чым прыцягальныя для вас народна-песенная традыцыя, духоўны свет старэйшых пакаленняў, вясковы лад жыцця, пра які вы многа пішаце?**

— Традыцыйнасць, у лепшым разуменні гэтага тэрміна, усё-такі абумоўлена вопытам нашага народа, а значыць, і вопытам нашай літаратуры. А народна-песенная традыцыя ўвогуле характэрная для нашай беларускай літаратуры. «Усе мы з хат», — сказаў Янка Сіпакоў. «Трэба дома бываць часцей», — радкі з верша Рыгора Барадуліна. Гэтыя выразы крылата панеслися эпіграфамі да многіх вершаў нашых паэтаў. Не, я абсалютна не бачу тут нейкай паралелі той самай спрэчнай «заземленасці»! Справа ў тым, што фальклор можна вывучыць, начытацца яго да лёгкага пошуму ў галаве, праслухаць сотні кіламетраў песенных стужак і нават абараніць кандыдацкую дысертацыю, а жывое народнае слова так і не захоча злучыцца з мастацкай выкладкай. Тут мастак павінен валодаць асаблівым слыхам, асаблівым «хірургічным» інструментам! Урэшце, і наша шаноўная метафара, якую мы ловім, як жар-птушку за хвост, таксама выпырхнула з жывой народнай стыхіі. Гэта заўсёды выдатна адчувалі творцы ўсіх часоў. Аб жыватворным уплыве фальклору яскрава сведчаць і лепшыя ўзоры рускай, украінскай, балгарскай, грузінскай, іспанскай, англійскай паэзіі. Я нарадзілася і вырасла ў вёсцы і гэтым абумоўліваецца ў большасці мой «вясковы літаратурны антураж». Добра помню свае першыя літаратурныя «творы» ў выглядзе пісем, якія пісаліся ад імя непісьменных жанчын на многія балючыя і радасныя адрасы. Гэта былі і пісьмы-споведзі, і пісьмы-прашэнні, і пісьмы-росшукі загінуўшых без вестак на той аклятай вайне. У сувязі з гэтым успамінаецца мне вечна скептычны жарт нябожчыка бацькі: «Законная наследніца яго правасхадзіцельства ўгодніка Георгія» (брат дзеда па бацькавай лініі калісьці служыў пісарам). І дзе яшчэ, як не ў той жа вёсцы 50—60-х гадоў, так адкрыта ступаў чалавек па зямлі з усімі сваімі непрыхаванымі радасцямі, бедамі і вясёлым дзівацтвам! А колькі жывой прыроднай мудрасці ў вясковых жыхароў!

**— Часам у крытыцы і размовах паэтаў чуваць нараканні на традыцыйнасць, фальклярызм, прывязанасць да вясковай тэматыкі, што, як мяркуюць, спараджае другаснасць. Ці згодны вы з гэтым? Ці ўзнікае для вас праблема другаснасці, самапаўтораў, тэматычнай вычарпанасці?**

— Я ўжо ў нейкай меры гаварыла пра сваю сувязь з фальклорам. Хочацца, каб яго толькі, часам, гэтак проста не абалваньвалі і паэты, і тыя, хто даследуе іх творчасць. У сапраўдных паэтаў ён ніколі не спародзіць другаснасці, а спародзіць тое зерне, якое надасць мастацкаму твору каштоўнасць пярліны, і твор па-новаму зайграе, засвеціцца ўсімі сваімі гранямі.

А праблема другаснасці павінна ўзнікаць для паэта, і асабліва тады, калі не проста рыфмуеш, скажам, «мілы — да магілы», а знаходзішся ў полі творчага напружання, у пошуку неасвоенага яшчэ мастацкага пласта. І тады другаснасць павінна з'явіцца той паловаю, якую неабходна адвеяць. Гэтак жа — і з самапаўторамі, і з «тэматычнай вычарпанасцю». Тут, відаць, да месца будзе добрая народная прымаўка: «Пад ляжачы камень і вада не цячэ». Не, я абсалютна не за тое, каб кожны месяц выдаваць, як кажуць, «на гара», але за тое, што мозг творцы павінен быць у пастаяннай рабоце.

**— Паміж навізной зместу і формы даволі складаная, апасродкаваная сувязь. І ўсё ж часам новы змест патрабуе новых сродкаў яго ўвасаблення. Ці ўзнікае ў вас жаданне звярнуцца да новых форм верша? Як адносіцеся да змястоўных і фармальных пошукаў іншых паэтаў?**

— Да новых форм верша? Прызнацца, у мяне ніколі не было такой праблемы. Да іншага, новага зместу, новага погляду на рэчы — гэта так. Змест верша фарміруе душа, работа душы, характар творцы, а за ўсім гэтым і як бы сама па сабе ўжо вынікае гатовая форма. Паэзія — гэта ўсё-такі не «кандальная» кітайская формачка ў выглядзе абутку, які з пялёнак надзявалі на ногі будучых жанчын, каб надаць ім вытанчанасць, або, скажам, як падобным метадам у негроіднай расе стваралася грацыя «лебядзінай шыі». Як пацвердзіла медыцына, падобныя метады тварэння «прыгажосці» непазбежна затым адбіваліся на развіцці ўсяго чалавечага арганізму! Чаму ж мы тады цэнім натуральнасць і шчырасць у размовах, натуральнасць чалавечых паводзін ды і... адзення, абутку, стравы — калі хочаце?! Упэўнена, што форма толькі сама па сабе ніколі не рабіла эвалюцыі ў паэзіі, на што звярнуў увагу прэзідэнт універсітэта «Парыж — VIII», доктар філалагічных навук Клод Фрыу: «Буйныя рускія і савецкія паэты не толькі пішуць выдатныя вершы, але з'яўляюцца мысліцелямі, філосафамі, сапраўднымі «ўладарамі дум». Паэзія — гэта «адчувальная думка», — казаў Маякоўскі. Яна заўсёды была багатая на ідэі, вобразы, на дачыненне да таго, што адбываецца ў краіне. У гэтым, я думаю, яе галоўнае адрозненне ад паэзіі французскай, якая занадта засяроджана на сабе самой і доўгі час растрачвала сябе на бясплённыя фармалістычныя пошукі. Зараз назіраецца яе адраджэнне».

Дапускаю нават геаметрычныя фігуры — трохкутнікі, трапецыі, конусы, піраміды — як форму. Але хай там гаворыць перш за ўсё чалавечая душа, а не сігналы электроннага робата. Менавіта душой, страсным напалам чалавечых пачуццяў, глыбінёй і маштабнасцю думкі размаўляе дасюль з намі высокая і незмяркаючая паэзія Маякоўскага, які быў перш за ўсё наватарам зместу. А пошук заўсёды неабходны паэту як умова ўдасканалення творчай асобы, яе росту. Я — за пошук, які не перарастае ў фатальны пошук. А літаратура — гэта перш за ўсё язык. Іншая справа, што гэты язык бывае залішне балбатлівым, або, як ў той з'едлівай прыпеўцы: «а музыка-без'языка едзе на авечцы». Чалавецтва, на шчасце, яшчэ не развучылася шчыраваць, перажываць, здзіўляцца, а значыць — і гаварыць!

**— Хацелася б пачуць вашы меркаванні аб такой складанай і балючай праблеме, як узаемаадносіны паэзіі і крытыкі. Ці чытаеце вы літаратуразнаўчыя, крытычныя працы? Што з прачытанага спадабалася, запомнілася, што выклікала непрыманне?**

— Са школьнай парты люблю і чытаю крытычныя і літаратуразнаўчыя работы. Без такога чытання не бачу развіцця асобы як творцы. Лаўлю сябе часта на тым, што асобныя крытычныя артыкулы чытаю як цікавыя высокамастацкія рэчы. Але думаецца і вось што: у кожным творчым і несапсаваным чалавеку павінен жыць як бы свой, «унутраны» крытык. Хай сабе такі самакантроль, як кажуць, раз на раз не прыходзіцца, але калі ў душы творцы будзе такое крытычнае «вока» — яно, безумоўна, дапаможа яму больш рэальна і цвяроза глядзець на свае творчыя здабыткі і з большым разуменнем прыслухоўвацца да слушных і небеспадстаўных заўваг спрактыкаванага крытычнага майстра. Мне, асабіста, іншым разам вельмі карысны такі крытычны «допінг».

**— Чаго, на вашу думку, не стае сучаснай крытыцы?**

— Сучаснай крытыцы, часам, не стае, пэўна ж, таго, чаго не хапае і сучаснай паэзіі. Ёсць бледныя крытычныя артыкулы, ёсць бледныя паэтычныя трактаты.

**— Якім вы ўяўляеце сабе «ідэальнага» крытыка?**

— О, усё сваё жыццё мы імкнёмся да ідэалу! Мяне задавальняе работа «ідэальнага» крытыка ў тым, што гэта разумны, творчы чалавек, за асобай і полем даследавання якога — дастаткова вывераная і абгрунтаваная пазіцыя, а не пракіслы «кампот» аргументаў з цынкавай пасудзіны спецакухара. Як вы маглі заўважыць, апошнім часам вядзецца гаворка і пра аб'ектыўнасць крытычных літаратурных адэнак. Так ці інакш — яны ўсе пачынаюцца з «суб'екта». Сам факт даследавання павінен мець сумленны, шчыры характар, сумленны прынцып падыходу да разгляду творчасці. Горш за ўсё, калі некаторыя літаратурныя спрэчкі зводзяцца да нейкай асабістай непрыязнасці ці сімпатыі.

(Заканчэнне на стар. 6—7).